5 (154)
май

Выдаецца са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

**НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**

Заснавальнікі:

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

*Рэдакцыйная калегія:*
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

*Рэдакцыйная рада:*
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

*Рэдакцыя:*
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактары аддзелаў — **Надзея Кушнер, Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ДА 1150-ГОДДЗЯ ПОЛАЦКА

Дзяніс Дук — Полацк IX—XI стагоддзяў: шлях да дзяржаўнасці 4

Сяргей Тарасаў — Старажытны Полацк: балканскі след 9

Марына Філіповіч — Полацкая зямля ў беларуска-літоўскай летапіснай традыцыі 20

Іна Калечыц — Графіці на слупах Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы 32

Алесь Суша — Бібліятэкі ў адукацыйнай прасторы даўняга Полацка 38

**МЕТОДЫКА. ВОПЫТ**

| | | |
|---|---|---|
| Вячаслаў Лазіцкі | Навукова-метадычны аналіз вучэбнага занятку з прымяненнем электронных сродкаў навучання | 46 |
| Валерый Варганаў | Фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцей на ўроках гісторыі | 51 |
| Галіна Саўко | Ацэнка ролі асобы на ўроках гісторыі | 58 |
| Аляксандр Корзюк | Адлюстраванне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX стагоддзя ў айчынных падручніках і вучэбных дапаможніках для сярэдняй школы | 62 |
| Людміла Трыгорлава | Хрэстаматыя ў школьным курсе гісторыі: роля і тэхналогія работы з тэкстам | 70 |
| Аліна Пахваліонная | Конкурс "Славутыя імёны Бацькаўшчыны" *(IX клас)* | 73 |
| | Содержание | 79 |
| | Summary | 80 |


***У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.***


***Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1;***
***Тэлефоны: +375-29-569-83-95 (МТС), +375-29-655-67-11 (Velcom).***
**http://aiv.by; e-mail: bhc.redaktor@tut.by.**
**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 14.05.2012 г.
Выхад у свет 25.05.2012 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 $^1/_8$.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 1085 асобнікаў. Зак. 0742.
*Надрукавана ў друкарні ААТ «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0494112 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


**Да ведама аўтараў!**
**За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (нажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.**

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютарнай настольна-выдавецкай сістэмы.


© **«Беларускі гістарычны часопіс», 2012.**

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Навукова-метадычны аналіз вучэбнага занятку з прымяненнем электронных сродкаў навучання

*Электронныя сродкі навучання шырока выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе. Аднак неабходна заўсёды мець на ўвазе, наколькі яны карысны пры вывучэнні адпаведнага матэрыялу школьнай праграмы. Прапануюцца крытэрыі паэтапнага аналізу праведзенага ўрока або факультатыўнага занятку з прымяненнем электронных сродкаў навучання.*

Вучэбны занятак, які праводзіцца з выкарыстаннем інфармацыйных педагагічных тэхналогій, уяўляе сабой шматэлементную па сваім змесце структуру. Ён з'яўляецца лагічна закончаным, цэласным элементам вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сучаснай сістэме адукацыі (урок, факультатыўны занятак), складаецца з асноўных кампанентаў вучэбна-выхаваўчага працэсу: мэты і задач, зместу, формы, метадаў, сродкаў (як традыцыйных, так і электронных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па прадмеце), узаемазвязанай дзейнасці выкладчыка і вучня. Пры шырокім укараненні інфармацыйных тэхналогій у адукацыйную практыку неабходна вызначыць асноўныя падыходы да аналізу правядзення вучэбных заняткаў з прымяненнем электронных сродкаў навучання (ЭСН).

Пры выбары схемы аналізу вучэбнага занятку з прымяненнем ЭСН мэтазгодна ўлічваць падрыхтаванасць вучняў, умець адабраць неабходную вучэбную інфармацыю, мадэліраваць умовы і сродкі навучання. Вучэбны занятак павінен разглядацца не толькі як дзейнасць настаўніка, гэта значыць як форма навучання, але і як дзейнасць вучня, гэта значыць як форма вучэння з выкарыстаннем дыдактычнага і тэхнічнага патэнцыялу электронных і традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК).

Паспяховасць вучэбнага занятку па гісторыі з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання вызначаецца шэрагам фактараў, галоўнымі з якіх з'яўляюцца метадычнае забеспячэнне, здольнасць настаўніка арганізаваць дыдактычны працэс, умен-



***ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.***

*Выконваючы абавязкі загадчыка кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук . Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфіі "Навукова-метадычныя асновы выкарыстання ЭСН па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (на прыкладзе гісторыі)" (Мн., 2009).*

не вучняў працаваць з камп'ютарным абсталяваннем. Пры планаванні вучэбнага занятку неабходна ўлічваць спецыфіку выкарыстання ЭСН, а таму правільна размеркаваць час пры яго правядзенні.

**Алгарытм праектавання настаўнікам вучэбнага занятку і яго правядзення складаецца з наступных этапаў:**

— вызначэнне мэты занятку;

— вызначэнне псіхолага-педагагічных фактараў і ўмоў, якія ўплываюць на дасягненне пастаўленай мэты;

— аналіз вучэбнага матэрыялу (што і якім чынам неабходна засвоіць вучням);

— выпрацоўка варыянтаў і этапаў дасягнення адукацыйнай мэты;

— пабудова вучэбнай мадэлі занятку (мадэліраванне);

— рэалізацыя праекта;

— ацэнка вынікаў занятку і параўнанне іх з тымі, якія планаваліся (рэфлексія).

Аналіз эфектыўнасці рэалізацыі дадзенага алгарытму і адукацыйнага праекта на вучэбным занятку з прымяненнем ЭСН можна выкарыстаць для ацэнкі прафесійнай дзейнасці настаўніка. Пры гэтым неабходна ўлічваць узровень вучэбных дасягненняў вучняў; правесці аналіз дакументальнага забеспячэння настаўнікам адукацыйна-выхаваўчага працэсу, яго грамадска-педагагічнай дзейнасці і арганізацыю пазаўрочнай работы па прадмеце, праектна-даследчую, эксперыментальную, метадычную работу.

**Пры аналізе вучэбнага занятку дзейнасць настаўніка разглядаецца па наступных крытэрыях:**

— методыка выкарыстання электронных сродкаў навучання на ўроку (распрацаваная і адаптаваная методыка; аўтарская методыка выкарыстання такіх сродкаў і г.д.);

— метады выкарыстання ЭСН (наколькі абраныя метады прымянення ЭСН садзейнічаюць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў і вырашэнню дыдактычных задач).

Якасны самааналіз праведзенага вучэбнага занятку дэманструе здольнасць педагога да рэфлексіі асабістых дзеянняў і творчасці. У дадзеным выпадку **крытэрыямі паспяховасці можна лічыць наступныя:**

— задавальненне настаўніка, калег, адміністрацыі і вучняў дасягнутым вынікам;

— наяўнасць апраўданай, карыснай і педагагічна прываблівай навізны;

— выбраныя адпаведна тэме формы і метады, прыёмы навучання;

— карэктнае выхаваўча-адукацыйнае ўзаемадзеянне настаўніка і вучняў;

— актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў;

— наяўнасць эмацыянальна станоўчай абстаноўкі, зацікаўленасць вучняў у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

— улік інтарэсаў і здольнасцей кожнага вучня;

— выкарыстанне электронных і традыцыйных сродкаў навучання.

Пры аналізе вучэбнага занятку мэтазгодна вызначыць, наколькі неабходна прымяненне ЭСН на дадзеным занятку, ці выконваецца дыдактычная роля ЭСН для арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, абранаму метадычнаму апарату для кожнага этапа ўрока. Пры ацэнцы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучня неабходна вызначыць, як выкарыстанне ЭСН адлюстроўваецца на яго актыўнасці, яго працаздольнасці на розных этапах урока, як рэалізуецца самастойная дзейнасць вучня падчас такога занятку.

Пры абгрунтаванні адукацыйнага праекта (мадэлі) настаўнік, як правіла, вызначае месца вучэбнага занятку ў тэме, раздзеле, курсе, характарызуе змест адабранага вучэбнага матэрыялу, а таксама метады і формы арганізацыі вучэбнага працэсу. Абгрунтоўваючы свой выбар, настаўнік вызначае вядучыя дыдактычныя тэорыі, канцэпцыі і адукацыйны вопыт, на які ён абапіраўся пры праектаванні. Да абгрунтавання праекта неабходна ўлічыць і вынікі дыягностыкі асобы вучня, якія могуць быць атрыманы шляхам тэсціравання, педагагічныхназіранняў, экспертнай ацэнкі іх вучэбных і выхаваўчых магчымасцей.

**Вызначым, што ўяўляе сабой адукацыйны праект (мадэль):**

— мадыфікацыя (рацыяналізацыя, аптымізацыя і г.д.) свайго педагагічнага вопыту;

— перайманне і выкарыстанне вопыту іншых аўтараў;

— прымяненне на практыцы навуковых распрацовак;

— навуковае і метадычнае абгрунтаванне эксперыменту.

Настаўнік абавязаны дакладна вызначаць від дзейнасці, у выніку якой быў зроблены дадзены дыдактычны праект:

— мадыфікаваная дзейнасць (праект мае аналаг або прататып);

— камбінаваная дзейнасць (праект з'яўляецца вынікам аналізу, падзелам цэлага на часткі і камбінацыяй гэтых частак па-новаму);

— наватарская дзейнасць (праект з'яўляецца прынцыпова новым, не мае аналагаў).

Пры аналізе вучэбнага занятку з прымяненнем ЭСН неабходна ўдзяляць увагу тэхналогіям па ахове здароўя і выкананню тэхнічных санітарна-гігіенічных і эрганамічных патрабаванняў да ўрока. Правядзенне рэлаксацыі і фізкультхвілінкі для вачэй на такіх занятках абавязкова!

Для ажыццяўлення аналізу вучэбнага занятку з прымяненнем электронных сродкаў навучання прапануем наступны алгарытм.

**I. Крытэрыі аналізу мэты вучэбнага занятку.**

1. Правільнасць і абгрунтаванасць мэты вучэбнага занятку з улікам праграмных патрабаванняў, зместу, неабходнага ўзроўню ведаў і ўменняў вучняў, месца вучэбнага занятку ў плане заняткаў па тэме, прагназаванне канчатковага выніку навучання.

2. Формы і метады прадстаўлення мэты вучням.

3. Ступень дасягнення пастаўленай мэты.

**II. Крытэрыі аналізу структуры і арганізацыі вучэбнага занятку.**

1. Адпаведнасць структуры вучэбнага занятку яго мэце і тыпу.

2. Лагічная паслядоўнасць і ўзаемасувязь этапаў вучэбнага занятку.

3. Размеркаванне часу на вучэбным занятку.

4. Рацыянальнасць і сістэмнасць выкарыстання электронных і традыцыйных сродкаў навучання.

5. Аптымальны тэмп вядзення занятку.

6. Арганізацыя пачатку і заканчэння вучэбнага занятку.

7. Ступень рэалізацыі праекта (мадэлі) занятку.

**III. Крытэрыі аналізу зместу вучэбнага занятку.**

1. Адпаведнасць зместу занятку патрабаванням адукацыйнага стандарту і вучэбнай праграмы.

2. Паслядоўнасць выкладання вучэбнага матэрыялу.

3. Даступнасць тлумачэння матэрыялу.

4. Навуковасць пры вывучэнні матэрыялу (ці адпавядае ўзровень складанасці вучэбнага матэрыялу пры тлумачэнні настаўнікам узроўню складанасці зместу вучэбнага дапаможніка).

5. Выдзяленне асноўных элементаў тэмы.

6. Сувязь зместу вучэбнага занятку з патрэбамі і інтарэсамі вучняў.

7. Фарміраванне самастойнага мыслення, актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці абранымі сродкамі (электроннымі і традыцыйнымі кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі).

**IV. Крытэрыі аналізу методыкі правядзення вучэбнага занятку (дзейнасць настаўніка).**

1. Правільнасць вызначэння метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання з улікам метадычных прынцыпаў і ўмоў сістэмнага прымянення электронных і традыцыйных сродкаў навучання па гісторыі; спецыфікі прадмета; тэмы і мэты вучэбнага занятку; магчымасцей класа; магчымасцей настаўніка; наяўнасці вучэбна-метадычнай базы.

2. Актуалізацыя апорных ведаў.

3. Фарміраванне ў вучняў тэарэтычных ведаў (як настаўнік актуалізаваў асноўныя тэарэтычныя ідэі і паняцці па тэме).

4. Якаснае засваенне новага матэрыялу (як і з дапамогай якіх прыёмаў і сродкаў настаўнік вызначае ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, а таксама засваенне агульнавучэбных і спецыяльных спосабаў дзейнасці).

5. Выкарыстанне сродкаў навучання (электронных і традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі), а таксама аптымізацыя навучальнай, кантрольна-ацэначнай, карэкціровачнай функцый ЭСН.

6. Арганізацыя настаўнікам самастойнай работы вучняў з улікам індывідуальных асаблівасцей навучання (тыпы, віды і формы трэнінгавых заданняў, ступень складанасці, варыятыўнасць).

7. Аналіз у дзяцей матывацыі да навучання.

8. Характар праверкі ведаў вучняў настаўнікам. Віды кантролю: адаптаваны або неадаптаваны да зместу вучэбнага матэрыялу інструментарый ЭСН, тэсціраванне традыцыйнымі сродкамі. Аб'ектыўнасць выстаўлення адзнак, іх матывіроўка, выхаваўчы і стымулюючы характар.

9. Педагагічная культура настаўніка гісторыі: тэмп мовы, дыкцыя, эмацыянальнасць пры падачы матэрыялу, дакладнасць выкарыстання спецыяльнай тэрміналогіі, камунікатыўныя здольнасці, прыёмы ўздзеяння на вучняў.

**V. Крытэрыі аналізу работы вучняў на вучэбным занятку.**

1. Выкарыстанне ЭСН для самаарганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў, для іх індывідуальнай актыўнасці.

2. Актыўнасць і працаздольнасць вучняў на розных этапах урока.

3. Інтарэс да тэмы і вучэбнага занятку.

4. Ступень навучанасці вучняў. Узровень ведаў, уменняў і навыкаў, асэнсаванасць і грунтоўнасць пры іх атрыманні.

5. Валоданне агульнавучэбнымі і спецыяльнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

6. Спалучэнне калектыўнай і індывідуальнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

7. Валоданне навыкамі самакантролю.

8. Уменне самастойна набываць веды і ўменне іх аналізаваць.

9. Культура міжасабовых адносін.

10. Змяненне матывацыі да навучання.

11. Уменне здзяйсняць рэфлексію як саміх вучэбных дзеянняў, так і іх вынікаў.

**VI. Крытэрыі аналізу дамашняга задання.**

1. Метады і прыёмы праверкі дамашняга задання.

2. Матывацыя дамашняга задання на занятку, яго мэты і асэнсаванне гэтых мэт вучнямі.

3. Аб'ём дамашняга задання.

4. Характар дамашняга задання (трэніровачны, творчы, замацавальны, развіваючы, дыферэнцыраваны).

5. Узровень цяжкасці дамашняга задання для кожнага вучня.

6. Падрыхтаванасць вучняў на працягу ўрока да выканання дамашняга задання.

**VII. Крытэрыі ацэнкі санітарна-гігіенічных умоў вучэбнага занятку.**

1. Падрыхтаванасць сродкаў навучання да ўрока (электронных і традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі).

2. Адпаведнасць абсталявання класа ўзросту вучняў.

3. Узровень асвятлення, чысціня памяшкання.

4. Размяшчэнне вучняў у класе з улікам іх асаблівасцей здароўя.

5. Прыёмы і метады работы над паставай вучняў.

6. Выкананне рэжыму работы з электроннымі сродкамі навучання ў адпаведнасці з санітарна-гігіенічнымі патрабаваннямі (тэхнічныя і эрганамічныя ўмовы выкарыстання ЭСН).

7. Выкананне рэжыму праветрывання. Правядзенне гімнастыкі для вачэй, фрагментаў рэлаксацыі і элементаў аўтатрэнінгу.

8. Выкананне правіл аховы працы і тэхнікі бяспекі.

**VIII. Псіхалагічны аналіз вучэбнага занятку.**

1. Псіхалагічны стан вучняў на пачатку і ў ходзе вучэбнага занятку (гатоўнасць да занятку, узровень трывогі і яе прычыны).

2. Прыцягненне ўвагі вучняў, яе ўстойлівасць на розных этапах занятку.

3. Развіццё і трэніроўка памяці вучняў: як арганізацыя вучэбнага занятку садзейнічала развіццю ўсіх відаў памяці (механічна-сэнсавага, адвольнага, неадвольнага, коратка-зрокавага), арганізацыі асноўных працэсаў памяці (успрыняцце, запамінанне, захаванне і ўзнаўленне).

4. Развіццё мыслення вучняў: стварэнне праблемных сітуацый, выкарыстанне заданняў, пры выкананні якіх праводзяцца разумовыя аперацыі (параўнанне, аналіз, сінтэз, абагульненне, канкрэтызацыя, сістэматызацыя, абстрагаванне), стварэнне ўмоў для развіцця творчага мыслення.

5. Развіццё ўяўлення вучняў пра змест вучэбнага матэрыялу традыцыйнымі сродкамі навучання і з дапамогай ЭСН.

6. Арганізацыя прыёмаў для асэнсаванага ўспрыняцця матэрыялу.

7. Выкарыстанне эмоцый вучняў падчас навучання.

8. Наколькі вучэбны занятак садзейнічаў агульнаму развіццю асобы вучняў.

9. Веданне настаўнікам узроставай псіхалогіі і наяўнасць псіхалагічнага кантакту з аўдыторыяй.

На аснове прапанаваных алгарытмаў аналізу вучэбнага занятку з выкарыстаннем ЭСН рыхтуюцца:

заключэнне настаўнікам або метадыстам, у якім даецца ацэнка ступені дасягнення мэты ўрока;

ацэнка вынікаў урока (аптымальнасць вучэбных дзеянняў настаўніка, якасць ведаў, уменняў і навыкаў вучняў);

аргументаваная характарыстыка станоўчых педагагічных элементаў урока;

заўвагі па рабоце з ЭСН;

адзначаюцца недахопы вучэбнага занятку, даецца дыягностыка іх прычын і прапановы па іх ліквідацыі;

ацэньваецца абгрунтаванасць вывадаў і выстаўленне адзнак;

даюцца рэкамендацыі настаўніку па самаадукацыі на аснове вывадаў і прапаноў.

**Літаратура**

Бабанский Ю.К. Оптимизация учебно-воспитательного процесса. Методические основы. М., 1982.

Беспалько В.П. Образование и обучение с участием компьютеров (педагогика третьего тысячелетия). Воронеж, 2002.

Добрынин Н.Ф. Психологический анализ урока. М., 1952.

Конаржевский Ю.А. Анализ урока. М., 2003.

Кульневич С.В. Анализ современного урока. М., 2006.

Лазіцкі В.Л. Навукова-метадычныя асновы выкарыстання ЭСН па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (на прыкладзе гісторыі). Мн., 2009.

Львова Ю.Л. Творческая лаборатория учителя. М., 1992.

Охитина Л.Т. Психологические основы урока. М., 1977.

Педагогическая психология: хрестоматия / Сост. Н.В.Носова, О.Н.Щепилина. СПб., 2006.

Селевко Г.К. Научи себя учиться. 2-е изд. М., 2006.

Симонов В.П. Педагогический менеджмент: 50 НОУ-ХАУ в области управления образовательным процессом: учеб. пособие. М., 1999.

Шамова Т.И. Управление образовательными системами. М., 2002.